## ПАМЯТКА ДЛЯ БАЦЬКОЎ ПА РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ ЗНОСІН ДЗЯЦЕЙ ВА ЎМОВАХ БЛІЗКАРОДНАСНАГА БІЛІНГВІЗМУ

- Для гарманічнага авалодання маўленнем ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму неабходна шмат часу надаваць абедзюм мовам (у ідэале рускай і беларускай мове – пароўну). Пры гэтым руская мова выкарыстоўваецца дзецьмі штодня ва ўсіх магчымых відах-дзіцячай дзейнасці, а беларуская мова – у адпаведнасці з прынцыпам «адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова».
- Для развіцця дыялагічнага беларускага маўлення нельга адмаўляцца ад зносін з дзіцем на беларускай мове ў карысць рускай мовы, нават у тым выпадку, калі зносіны на рускай мове ажыццяўляюцца з іншымі членамі сям'і і соцыума.
- Часцей абмяркоўвайце важныя для дзіцяці праблемы не на рускай мове, на якой размаўляе большасць грамадства, а на беларускай мове, прытрымліваючыся прынцыпу «адна асоба ў адной сітуацыі зносін – адна мова».
- Паміж сабой (дома і на вуліцы) бацьку і маці  лепш размаўляць  на беларускай мове, каб дзіця ўспрыняла яе як мову зносін, роўную па статусе рускай мове. Заўважым, што ўступаць ў зносіны паміж сабой на беларускай мове дарослым пажадана ў любым асяроддзі (ні ў якім разе нельга саромецца зносін на беларускай мове).
- Бацькам пажадана звярнуць увагу на пашырэнне функцый беларускай мовы,  выкарыстанне якой нярэдка абмежавана для дашкольнікаў дзіцячым садам (у пэўныя дні) і домам. Ад таго, дзе гавораць на беларускай мове, нараджаецца матыў, навошта яе вучыць. Беларуская мова павінна стаць для дзіцяці мовай вуліцы, мовай тэатра і кіно, кніг, гульнявой пляцоўкі, падарожжаў.
- Штодзённую інфармацыю пра вашы дзеянні трэба паведамляць дзіцяці на дзвюх мовах паслядоўна  ураўнаважваючы іх па значнасці.
- Недапушчальна змешваць мовы ва ўласным маўленні. Дзеці капіруючы маўленчыя паводзіны іншага чалавека, спазнаюць жывую культуру камунікацыі, а пасля увасабляюць яе ў сваіх зносінах.
- У працэсе беларускамоўных зносін не пакідайце па-за ўвагай змешванне дзеткамі у адным выказванні рускай і беларускай моў. Паспрабуйце падказаць дзіцяці, як сказаць правільна толькі на беларускай мове ці запытайцеся ў яго па-беларуску яшчэ раз, даючы зразумець, што яно ў чымсьці памылілася.

